*В. І. Свірыдзенка (Мінск)*

## Выкарыстанне тэксту пры азнаямленні малодшых школьнікаў з сінтаксічнымі адзінкамі

Мова непасрэдна суадносіцца з працэсамі мыслення і камунікацыі, таму асэнсаванне яе сінтаксічнай сістэмы і авалоданне багаццем яе ладу неабходна для развіцця і ўдасканалення маўлення, а таксама для выхавання культуры маўленчых зносін вучняў. Вучонымі-метадыстамі падкрэсліваецца неабходнасць асэнсавання сінтаксісу ва ўсіх класах, на ўсіх этапах навучання. Методыка беларускай мовы разглядае гэты раздзел граматыкі як аснову, на базе якой асэнсоўваецца і засвойваецца ўвесь курс роднай мовы ў сярэдняй школе, што знаходзіць адлюстраванне ў ідэях вывучэння марфалогіі на сінтаксічнай аснове і ва ўвядзенні паняцця «тэкст» з устаноўкай на яго аналіз і сінтэз з пункту гледжання характэрных для сінтаксічнага цэлага структурных і семантычных прымет. Сінтаксіс уцягвае ў сваю сферу розныя сродкі мовы, таму як для методыкі сінтаксісу, так і для методыкі развіцця маўлення актуальнай з'яўляецца ідэя пастаяннай увагі да міжузроўневых сувязяў моўных сродкаў і іх праяўлення ў сінтаксісе маўлення. Гэты раздзел граматыкі мае сістэму адзінак рознага ўзроўню. Узаемадзеянне паміж імі рэалізуецца ў маўленні. «Чым вышэй узровень, да якога належыць дадзеная сінтаксічная адзінка, тым дынамічней, свабодней сувязь паміж яе кампанентамі, тым вышэй ступень яе непасрэднага ўдзелу ў маўленні» [1, 159]. Пры вывучэнні сінтаксісу ў маўленчым аспекце неабходна раскрываць перад вучнямі механізм узаемадзеяння розных сінтаксічных канструкцый, асабліва ў межах тэксту.

Азнаямленне са словазлучэннем і сказам у пачатковых класах павінна весціся так, каб засваенне тэарэтычнага моўнага матэрыялу і ўся разнастайнасць практыкаванняў накіроўваліся на вырашэнне найважнейшай задачы — развіццё маўленчай культуры вучняў. Спынімся на некаторых відах практыкаванняў, у якіх тэкст выкарыстоўваецца ў якасці дыдактычнага матэрыялу. З мэтай выпрацоўкі ўмення правільна інтанаваць сказы, ставіць у канцы іх адпаведныя знакі прыпынку вучням другога класа можна прапанаваць такое заданне:

Спісаць, паставіць адпаведныя знакі прыпынку. Выразна прачытаць тэкст па ролях.

| | |
|---|---|
| — Што, сябры, для жыта трэба_ | — А для казкі_ |
| — Ну, вядома, трэба глеба_ | — Цішыня_ |
| — А для птушкі_ | — Ну, а што для весялосці_ |
| — Вышыня_ | — Каб часцей бывалі … _ (М. Гелер.) |

Для вызначэння межаў сказаў у тэксце другакласнікам можна прапанаваць наступнае практыкаванне:

Падзяліць тэкст на сказы, паставіць адпаведныя знакі прыпынку. У першым падкрэсліць, аб чым гаворыцца ў сказе, што гаворыцца.

*Пчальнік*

Гудзе і звініць калгасны пчальнік колькі тут руху ў цёплы сонечны дзень маленькі Міхалка паважна расхаджвае між казачнага пчалінага гарадка дзядуля яшчэ з усходам сонца паехаў у горад па новыя вуллі, а яго пакінуў сваім намеснікам сёння ён тут поўны гаспадар (Паводле А. Якімовіча.)

Практыкаванні на ўзнаўленне дэфармаванага тэксту ў 2 класе могуць мець наступны выгляд:

Прачытаць выразна сказы. Паставіць іх у неабходнай паслядоўнасці, каб атрымаўся звязны тэкст, выкарыстаць у канцы сказаў патрэбныя знакі прыпынку: а) Прыйшоў верасень б) Яны радуюцца пачатку навучальнага года в) Дзеці спяшаюцца ў школу г) Як тут светла і ўтульна д) Вучні заходзяць у светлы клас е) Пачынаецца першы ўрок ж) Звініць званок

Правядзенне творчых практыкаванняў мае на мэце развіваць у дзяцей назіральнасць, выклікаць жаданне падзяліцца сваімі ўражаннямі, фарміраваць уменне жвава і эмацыянальна расказваць пра ўбачанае. Вучням прапануюцца такія заданні:

Прачытаць.

*Прадвесне*

Вясна нясе на зямлю вялікія змены. Веліч гэтых змен адчуваецца з кожным днём усё ярчэй…

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Дапісаць апавяданне па пачатку, выкарыстоўваючы спалучэнні слоў: блакітнае неба, песня жаваранка, лёгкі ветрык, сушыць зямлю, зялёныя лісточкі, прыемна пахнуць, цудоўны настрой.

Пераказ тэксту па калектыўна складзенаму плану.

а) Чытанне апавядання, запісанага на дошцы.

*Вясна*

Стаяць цудоўныя дні. Ярка свеціць вясновае сонейка. Яго цёплыя праменні саграваюць зямлю.
На ўзвышшах зазелянела маладая траўка. Цёмныя лясы ўпрыгожыліся сінімі галоўкамі пралесак.
Чарнее ў полі свежая ралля. Ад рання да ночы тут гудуць трактары.

б) Пастаноўка вучнямі пытанняў да кожнай часткі. Запіс плана на дошцы, запаўненне слоўніка.

| ***Пытанні*** | ***Слоўнік*** |
|---|---|
| 1. Якое надвор'е стаіць вясной? | цудоўныя дні, веснавое сонейка, цёплыя праменні |
| 2. Як змяніліся расліны? | на ўзвышшах, галоўкі пралесак |
| 3. Што адбываецца вясной у полі? | свежая ралля, ад рання да ночы |

в) Паўторнае чытанне тэксту вучнямі і самастойны запіс пераказу.

Выкарыстанне тэксту пры азнаямленні малодшых школьнікаў з сінтаксічнымі адзінкамі спрыяе фарміраванню уменняў дыферэнцыраваць адценні значэнняў граматычных канструкцый, вызначаць іх стылістычную афарбоўку, экспрэсіўныя магчымасці, суадносіць значэнне граматычных канструкцый са зместам выказвання і правільна адбіраць іх пры афармленні звязных выказванняў.

*Літаратура*

1. Методика развития речи на уроках русского языка / Под ред. Т. А. Ладыженской. М., 1991.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ